*Г. К. Тычко*

# МАСТАЦКАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ І МАСАВАЯ ЛІТАРАТУРА

Паняцце «масавая літаратура» – неадназначнае. Эвалюцыю ўяўленняў пра сутнасць гэтай з'явы ў нейкай ступені адлюстроўваюць яе дэфініцыі. Так, «Літаратурны энцыклапедычны слоўнік» сцвярджае, што «масавая літаратура – буйнатыражная забаўляльная і дыдактычная белетрыстыка 19–20 стагоддзяў», якая «з'яўляецца складовай часткай "індустрыі культуры"» [1, с.213]. Расійскі даследчык П. Мядзведзеў, падкрэсліваючы шматзначнасць тэрміна, яго сінанімічныя варыянты: папулярная, трывіяльная, пара-, бульварная літаратура – адзначае, што «традыцыйна гэтым тэрмінам пазначаюць: "вартасны ніз" літаратурнай іерархіі, творы, якія адносяць да маргінальнай сферы агульнапрызнанай літаратуры, адпрэчваныя як кітч, псеўдалітаратура» [2, с.514].

У кнізе Стывена Лоўэла і Біргіт Менцэль «Забаўляльнае чытанне ў сучаснай Расіі. Постсавецкая масавая літаратура ў гістарычнай перспектыве» пазначана: «Савецкая масавая літаратура адрознівалася ад заходняй папулярнай літаратуры некалькімі асноватворнымі рысамі. Па-першае, яна заставалася адданай мэце маральнага ўдасканалення дзякуючы чытанню і па гэтым чынніку выключыла тыпы пісьма, якія былі надзвычай паспяховыя і ўплывовыя на Захадзе. Напрыклад, існаванне савецкага штукарскага рамана неверагодна было б уявіць нават у 80-я гады. Па-другое, савецкія пісьменнікі не працавалі на рынку, а таму не праяўлялі цікавасці да развіцця шляхоў масавага абароту. Па-трэцяе, пад жанры савецкай масавай літаратуры была падведзеная маральная аснова, якая аказалася цалкам чужой заходняй літаратуры…» [3, с.35]. Паколькі беларуская літаратура была неад'емным складнікам савецкай, для яе таксама былі ўласцівыя пазначаныя асаблівасці. Хаця, безумоўна, паасобныя аўтары і ў савецкія часы ў пэўнай ступені імкнуліся завабліваць чытача і павялічыць тыраж сваіх твораў, плённа выкарыстоўваючы прыёмы забаўляльна-дэтэктыўных жанраў. Да прыкладу, можна згадаць «Палескія рабінзоны» Я. Маўра або «Дзікае паляванне караля Стаха» У. Караткевіча.

У амерыканскім літаратуразнаўстве існуюць такія паняцці, як «mass literature» (масавая літаратура) і «popular fiction» (папулярная літаратура), размежаванне якіх адбываецца пераважна ў рамках

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуралагічных даследаванняў. Тут прынята вылучаць чатыры функцыянальныя вобласці: folk culture – popular culture (=masscult) – midculture – elite culture. У артыкуле «Папулярная культура: каментарыі па вызначэнні паняцця» прафесар Р. Браун перапрацаваў гэтую структуру, выбудоўваючы яе ў парадку folk culture – mass culture – popular culture – elite culture, і прыйшоў да высновы, што папулярная культура схільная выкарыстоўваць напрацоўкі як народнай, так і масавай культуры, пры гэтым не адмаўляючы ўзаемасувязь з элітарнай. Пераканаўчым доказам гэтага даследчык лічыў раман Г. Мелвіла «Мобі Дзік, альбо Белы Кіт» [4, с.17].

Нацыянальная масавая літаратура Беларусі – пытанне спрэчнае і мала даследаванае. Існаванне яе найчасцей адмаўляецца, але разам з тым айчынныя навукоўцы, якія вывучаюць сучасны літаратурны працэс, імкнуцца разабрацца ў спецыфіцы функцыянавання масавай літаратуры ў нацыянальным мастацкім дыскурсе. Праўда, так званая «беларуская масавая літаратура» дрэнна ўпісваецца ў традыцыйныя ўяўленні аб культурным феномене, паколькі для многіх пераканаўча гучыць тэзіс аб немагчымасці яе існавання ў краіне, дзе тыраж кнігі не перавышае трох–пяці тысяч асобнікаў, а колькасць насельніцтва складае больш дзесяці мільёнаў (П. Васючэнка). Істотным лічыцца і той факт, што беларуская культура надзвычай спалучаная з нацыянальнай міфапаэтычнай вобразнасцю і мала прыстасаваная да адаптацыі іншародных мастацкіх элементаў. Важнымі чыннікамі слабаразвітасці масавай літаратуры ў Беларусі прызнаюцца пільная ўвага айчынных аўтараў да праблем нацыянальнага самавызначэння, а таксама маларухомасць і нізкая канкурэнтаздольнасць кніжнага рынкавага сектара, а адсюль – адсутнасць адладжаных выдавецкіх маркетынгавых стратэгій і тактык, слабая масмедыйная падтрымка. Прызнанне высокай мастацка-эстэтычнай каштоўнасці сучаснай беларускай прозы не садзейнічае прыцягненню да яе большага кола чытачоў. Пісьменнікі не заўсёды ўлічваюць іх інтарэсы і запатрабаванні, якія далёка не вычэрпваюцца традыцыйнымі ўяўленнямі пра прызначэнне літаратуры. Сучаснага чытача цікавіць кніга, якая ў аднолькавай меры ўтрымлівае элементы займальнага і сур’ёзнага, даступнага для разумення і неадназначнага, індывідуальна-асабістага і сацыяльна арыентаванага і, што не менш істотна, узнаўляе рэаліі сучаснай рэчаіснасці.

Навуковы статус паняццяў *popular fiction* (папулярная літаратура) *і mass literature* (масавая літаратура) у 60–70-я гг. XX

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ст. заставаўся спрэчным. Часам паняцце «папулярная літаратура» разглядалася як сінонім да традыцыйнага «масавая літаратура», таму выкарыстоўвалі яго выбарачна, як злучальнае звяно паміж «высокай» і «масавай». Разам з тым *popular fiction* па сваім складзе ўяўлялася неаднастайнай і разнаякаснай, тут былі вылучаныя нават свае вартасна-эстэтычныя ўзроўні. Напрыклад, «Лаліта» У. Набокава гэта – *highbrow*, «Чалавек у шэрым фланэлевым гарнітуры» С. Уілсана – *middlebrow*, «Пейтан Плейс» Г. Металэс – *lowbrow* [5].

У дачыненні да мідлкультавых праяў, у тым ліку літаратурных, неабходна прызнаць іх адмысловы статус памежнай зоны, якая валодае здольнасцю наладжваць дыялог паміж вартасна размежаванымі мастацкімі сістэмамі і генераваць новыя ідэі, сэнсы, прыёмы і сродкі выяўлення. Разам з тым неабходна адзначыць, што выдатныя творы мідлкультуры губляюцца ў гушчы нізкапробнай прадукцыі. У 90-я гг. ХХ ст. мідлліаратура заявіла аб сваім існаванні ў Расіі (творы Б. Акуніна, Д. Быкава, М. Велера, Я. Грышкаўца, В. Пялевіна, Л. Уліцкай). Свой статус мідлліаратура набыла тут найперш з-за арыентацыі на адмысловую спецыфіку мастацкага малюнка і на неадназначную мэтавую аўдыторыю. Сацыяльнае становішча – адна з нешматлікіх характарыстык мэтавай чытацкай групы, гэта так званы «сярэдні клас», які ў Расіі ўключае не толькі так званых «офісных інтэлектуалаў», а значна шырэйшыя пласты сучаснага грамадства.

Адрозненні паміж мастацкімі з'явамі «мідлліаратура», «белетрыстыка», «якасная папулярная літаратура», што ўжываюцца падчас характарыстыкі сучаснага літаратурнага працэсу, вельмі нязначныя і закранаюць у асноўным узаемаадносіны элітарнага, «высокага» і масавага ў літаратурным працэсе пэўнага гісторыка-культурнага перыяду.

Так, у Беларусі стан мідлліаратуры характарызуецца тым, што асноватворныя прыкметы яе тут выяўляюцца слаба. Арыентацыя на класіку, асаблівасці моўнай сітуацыі, спецыфіка функцыянавання кніжнага рынку (перавага расійскай і замежнай літаратуры, абмежаванае кола беларускамоўных чытачоў, дзяржаўнае рэгуляванне), неканкурэнтаздольная маркетынгавая палітыка не спрыяюць актыўнаму развіццю айчыннай масавай літаратуры. «У сённяшняй нашай культуры адсутнічае маскульт, прынамсі, у тым выглядзе, які на Захадзе ці ў Расіі, а памкненні "тутэйшых" стварыць забаўляльную літаратуру – дэтэктыў, трылер, эратычны раман – так і засталіся на ўзроўні дэкларацый», – слушна адзначае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Г. Кісліцына [6, с.96]. Аднак нельга не адзначыць схільнасць сучаснай нацыянальнай прозы да белетрызацыі, да пошуку новых тэм, ідэй, займальных сюжэтаў і сучасных вобразаў. Можна згадаць «Рыфма», «Збіральнік страху», «Армагедон-1895» Ю. Станкевіча, «Карабель», «Пабакі», «Прыгоды Базыля Беларуса» В. Гігевіча, «Прыгоды Рабунькі» і «Літоўскі воўк» А. Наварыча, «Шчарбаты талер» і «Рэвізія» А. Федарэнкі і інш. Нялішне прывесці з гэтай нагоды словы Д. Жукоўскага: «Не залічацца да ніжэйшага гатунку творы тых, хто будзе сумленна і адказна абуджаць у гэтым чытачу смак да жыцця (паводле Мілаша Формана: паказваць праўду, але не даваць нудзіцца)» [7, с.254].

Разам з тым масавы рынак са сваёй палітыкай мэтавай жанравай дыферэнцыяцыі, якая патрабуе сталага пашырэння, не здольны ў нашых умовах знайсці сваіх пастаянных адрасатаў і прыдатныя нішы. Падобная сітуацыя складваецца і ў іншых нацыянальных літаратурах, асабліва там, дзе існуе праблема «нечытаючага» маладога пакалення, інтарэсы якога аб’ектыўна пераарыентаваныя на візуальна-віртуальныя відовішчна-гульнявыя формы тэхнакультуры. З мэтай прыцягнення, а па сутнасці вяртання чытача да нацыянальнай кнігі ў Беларусі з часоў У. Караткевіча робяцца спробы стварыць айчынную займальную жанравую прозу. На гэтай ніве плённа працавалі і працуюць паслядоўнікі і пераемнікі У. Караткевіча: Л. Дайнека і В. Іпатава, К. Тарасаў і У. Арлоў. І нават культавы аўтар сацрэалізму І. Шамякін (прыгадаем яго «Сатанінскі тур») і інш. Разам з тым названыя аўтары і творы, выкарыстоўваючы элементы масавай літаратуры, усё ж рэальна ўкладваюцца ў рамкі літаратуры папулярнай. Што ж да масавай літаратуры, літаратуры «вартаснага нізу», то істотную ролю ў яе станаўленні адыграла літаб’яднанне «Тутэйшыя», куды ўваходзілі С. Кавалёў, А. Глобус, У. Сцяпан, А. Федарэнка і іншыя, з якім звязваецца станаўленне і развіццё папулярных жанраў у Беларусі. Так, Адам Глобус выступае пачынальнікам беларускай эратычнай літаратуры і коміксу («Дамавікамерон», «Дзікае паляванне»); Сяржук Сокалаў-Воюш стварае, па сутнасці, першы беларускі трылер («Крывавы памол»), Уладзімір Сокалаў (калектыўны псеўданім А. Глобуса, М. Адамчыка і М. Клімковіча) – дэтэктыў-баявік («Заўсёды светла каля турэмных муроў»), Тэафілія Сабоцкая (калектыўны псеўданім А. Глобуса, М. Адамчыка і М. Клімковіча) – дэтэктыў-трылер («Сапежынскі прывід»). Элементы прыгодніцкіх, дэтэктыўна-містычных жанраў, «памежныя»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асаблівасці мідллітаратуры з розным поспехам імкнуцца выкарыстоўваць А. Федарэнка, П. Місько, Л. Рублеўская, А. Наварыч, Ю. Станкевіч, Б. Пятровіч, С. Балахонаў і іншыя, як маладыя пісьменнікі, так і прадстаўнікі старэйшага пакалення.

---


1. *Муравьев, В. С.* Массовая литература / В. С. Муравьев // Литературный энциклопедический словарь / под общ. ред. В. М. Кожевникова, П. А. Николаева. − М., 1987. − С. 213−214.

2. *Медведев, П. Н.* Формальный метод в литературоведении / П. Н. Медведев. – М.: Лабиринт, 1993. – 206 с.

3. *Reading* for entertainment in contemporary Russia: post-Soviet popular literature in historical perspective / ed.: S. Lovell, B. Menzel. – München: Sagner, 2005. – 202 p.

4. *Brown, R.* Popular culture: notes toward a definition / R. Brown // Popular culture theory and methodology: a basic introd. / ed.: H. E. Hinds, M. F. Motz, A. M. S. Nelson. − Madison, 2006. − P. 15−22.

5. *Wood, R. P.* Lolita in Peyton Place: highbrow, middlebrow, and lowbrow novels of the 1950s / R. P. Wood. – New York: Garland Publ., 1995. – XI, 163 p.

6. *Кісліцына, Г. М.* Новая літаратурная сітуацыя: змена культурнай парадыгмы / Г. М. Кісліцына; НАН Беларусі, Ін-т літаратуры. – Мінск: Логвінаў, 2006. – 205 с.

7. *Жукоўскі, Д.* Літаратура для добраахвотнага чытання / Д. Жукоўскі // Arche = Пачатак. − 2002. − № 2. − С. 249−254.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ